PolotskSU

Министерство образования Республики Беларусь
Полоцкий государственный университет

# УСТОЙЧИВОЕ РАЗВИТИЕ ЭКОНОМИКИ: МЕЖДУНАРОДНЫЕ И НАЦИОНАЛЬНЫЕ АСПЕКТЫ

Электронный сборник статей
III Международной научно-практической online-конференции

(Новополоцк, 18–19 апреля 2019 г.)

Новополоцк
Полоцкий государственный университет
2019

PolotskSU

УДК 338.2(082)

**Устойчивое развитие экономики: международные и национальные аспекты** [Электронный ресурс] : электронный сборник статей III Международной научно-практической online-конференции, Новополоцк, 18–19 апреля 2019 г. / Полоцкий государственный университет. – Новополоцк, 2019. – 1 электрон. опт. диск (CD-ROM).

Впервые материалы конференции «Устойчивое развитие экономики: международные и национальные аспекты» были изданы в 2012 году (печатное издание).

Рассмотрены демографические и миграционные процессы в контексте устойчивого развития экономики; обозначены теоретические основы, практические аспекты управления человеческими ресурсами; выявлены и систематизированы драйверы инклюзивного экономического роста в Беларуси и за рубежом; раскрыты актуальные финансовые и экономические аспекты развития отраслей; приведены актуальные проблемы и тенденции развития логистики на современном этапе; отражены современные тенденции совершенствования финансово-кредитного механизма; освещены актуальные проблемы учета, анализа, аудита в контексте устойчивого развития национальных и зарубежных экономических систем; представлены новейшие научные исследования различных аспектов функционирования современных коммуникативных технологий.

Для научных работников, докторантов, аспирантов, действующих практиков и студентов учреждений высшего образования, изучающих экономические дисциплины.

*Сборник включен в Государственный регистр информационного ресурса. Регистрационное свидетельство № 3061815625 от 23.05.2018.*

Компьютерный дизайн обложки М. С. Мухоморовой.
Технический редактор Т. А. Дарьянова, О. П. Михайлова.
Компьютерная верстка И. Н. Чапкевич.

211440, ул. Блохина, 29, г. Новополоцк, Беларусь
тел. 8 (0214) 53 05 72, e-mail: a.lavrinenko@psu.by

**ISBN 978-985-531-648-1**

© Полоцкий государственный университет, 2019

PolotskSU

**ПАХОДЖАННЕ МОВЫ І ЭВАЛЮЦЫЙНАЯ ТЭОРЫЯ**

**А.Л. Ластоўскі,** канд. сацыял. навук**,** дац.
Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, Беларусь

Паходжанне мовы з’яўляецца адным з найбольш прывабных пытанняў для чалавечага розума, спробы адказу на яго можна знайсці і ў першых сакральных тэкстах (Біблія, Рыгведа), у антычных філосафаў, мысляроў-асветнікаў і г.д (Донскіх). Былі выпрацаваныя самыя розныя тэорыі: боскага паходжання, паходжання ад мовы жэстаў, працоўная тэорыя мовы і г.д. Толькі агляд розных тэорый можа нагадваць энцыклапедыю, дзе свае старонкі пакінулі самыя выбітныя сыны чалавецтва. Але, на жаль, даводзіцца прызнаць, што ўсе гэтыя тэорыі засноўваліся на гіпатэтычных рэканструкцыях (як магло быць), паколькі крыніцы для аднаўлення генезіса мовы недаступныя. Таму навуковасць гэтых тэорый досыць сумнеўная, і не адпавядае навуковым стандартам.

Тым не менш, сучасная навука ўсё ж імкнецца адказаць на гэтае пытанне, нават у апошнія дзесяцігоддзі мы можам назіраць новую хвалю зацікаўленасці, з’яўленне новых тэорый і рост даследаванняў [9].

Шмат у чым да гэтага спрычыніліся працы славутага лінгвіста і сацыяльнага філосафа Наома Хомскага, асабліва яго рэвалюцыйная праца “Сінтаксічныя стрыктуры”. Асноўнай мэтай працы Хомскага было фармалізаваць з матэматычнай строгасцю і дакладнасцю ўласцівасці ўніверсальнай граматыкі, гэта значыць, інструмента для атрымання ўсіх магчымых сказаў асобнай мовы. Такая граматыка, ці сінтаксіс, з'яўляецца аўтаномнай у адносінах да сэнсу сказу і фізічных структур (гукі, надпісы, знакі), якія перадаюць яго. Гэта чыста фармальная сістэма для размяшчэння слоў у шаблоне, які носьбіт мовы будзе лічыць правільным. Хомскі паказаў, што лагічная структура такой граматыкі значна больш складаная і цяжкая для фармулявання, чым мы маглі б меркаваць, і апісальныя прэдыкаты такой універсальнай граматыкі (сінтаксічныя катэгорыі, фаналагічныя класы) не сувымерныя з любой іншай сістэмай, вядомай у свеце. Акрамя таго, асноўны прынцып або логіка сінтаксічнай сістэмы не даецца адразу на паверхні, а мусіць быць адноўленая, што з’яўляецца цяжкой задачай нават для прафесійных лінгвістаў. Але мы ведаем, што дзеці лёгка навучаюцца валоданню мовы, нават без дапамогі дарослых.

Хомскі ў сваіх працах прапанаваў “інструмент для засваення мовы”, так званую “універсальную граматыку”, якая павінна была адпавядаць кожнай мове. Гэта схема ўяўляе сабою невялікі набор прынцыпаў, ці параметраў, якія прымаюць розныя значэнні ў розных мовах, вельмі абмежаваная, таму даступная і дзіцяці. Такім чынам, у мозг чалавека інтэграваная сістэма, дзякуючы якой дзеці засвойваюць правілы мовы, якую б ні ўжывалі навокал. Ва ўсіх мовах свае граматычныя сістэмы, але ў іх можна ўбачыць варыянты адной мадэлі [3].

Працы Хомскага выклікалі новае ажыўленне ў лінгвістычных дыскусіях пра паходжанне мовы, хоць у значнай ступені за кошт крытыкі аўтара тэорыі ўніверсальнай

PolotskSU

граматыкі. Асноўныя спрэчкі выклікала нежаданне Хомскага тлумачыць паўставанне гэтага ўніверсальнага моўнага механізма вынікам натуральнага адбору (і такім чынам, узгадняць яго з тэорыяй эвалюцыі). На яго думку, вывучэнне камунікацыі ў жывёл можа служыць толькі вызначэнню мяжы, дзе пачынаецца ўнікальны феномен мовы чалавека.

Адным з найбольш сур'ёзных крытыкаў Хомскага стаў Дэрэк Бінкертан, лінгвіст, спецыяліст па піджынам і крэольскім мовам. Згодна Бікертану, цяжкасці ўзніклі, таму што мы засяродзілі ўвагу на камунікацыі, а не больш базавай сістэме рэпрэзентацыі. Натуральны адбор спрыяе усё большай складанасці сістэмы ўспрыняцця і рэпрэзентацыі навакольнага свету. Наша адчувальнасць да наваколля дае перавагі перад канкурэнтамі.

У рэшце рэшт, аднак, цікаўнасць, увага і даўгачасная памяць дасягаюць той кропкі, калі ўзмацненне ў спазнанні свету, можа зыходзіць толькі ад больш складанай рэпрэзентацыі, і гэта тое, што забяспечвае мова. Такім чынам, мова - не сродак камунікацыі ў першую чаргу. Хутчэй за ўсё, гэта сістэма рэпрэзентацыі, сродак, каб аперыраваць і маніпуляваць мноствам інфармацыі. Калі ж узнікае гэтая новая рэпрэзентацыйная сістэма? На думку Бікертана, першы крок быў зроблены *Homo erectus*, калі была створана протамова, якая праз кароткія вакалізацыі, якія адсылалі да простых аб'ектаў ці канцэптаў. Такая пратамова ўласціва маленькім дзецям, ёй можна навучыць і шымпанзэ. Такая протамова валодае лексіконам, але не мае сінтаксісу і граматыкі. Але калі паўстала паўнавартасная мова з граматыкай? Паводле аўтара, яе можна зафіксаваць у *Homo sapiens*, анатамічна блізкіх да сучаснага чалавека за кошт паступовай эвалюцыі сінтаксічнай "біяпраграмы", праз невялікія мікрамутацыі. Хоць гэта пазіцыя выклікала таксама хвалю крытыкі, менавіта за кошт цяжкасці прадстаўлення пасярэдніцкіх стадый на шляху да фармавання паўнавартаснай мовы. Надалей Бікертан развівае сваю погляды праз выкарыстанне тэорыі фармавання нішаў. Жывёлы ў працэсе эвалюцыі не толькі займаюць нішы, але і фармуюць самі новыя нішы, і адаптуюцца да іх. Паяўленне мовы звязана было з пераходам чалавека з адной нішы ў другую – ад ніжэйшых да вышэйшых падальшчыкаў (гэта азначае, хто першымі доступ да падалі мелі ўжо людзі). Заняцце новай нішы запатрабавала змены сістэмы камунікацыі, з'явіліся сігналы-заклікі, якія патрэбна было перадаваць на дыстанцыі. Гукі і жэсты, якія абазначалі жывёл, паступова набывалі ўласцівасць перамяшчэння, дэкантэкстуалізацыі, яны пераўтвараюцца ў іканічныя знакі. З'яўленне сімвалаў запусціла далейшы працэс: як толькі мозг валодае знакамі з уласцівасцю перамяшчэння, то тады можна ствараць канцэпты, якія аб'ядноўваюцца ў протамову [1].

Важным тэкстам, які паўплываў на ўваход эвалюцыйнай лінгвістыкі ў мэйнстрым натуральным навукаў, стаў артыкул Стывена Пінкера і Пітэра Блума "Натуральная мова і натуральны адбор", дзе здольнасць людзей да моваў (асабліва да ўніверсальнай граматыкі), тлумачыцца як біялагічная адаптацыя, якую можна вытлумачыць у неадарвінісцкіх тэрмінах. Паходжанне мовы можа таксама разглядацца як вынік працэсаў селекцыі. Пінкер і Блум датуюць паходжанне мовы перыядам ад чатырох да двух мільёнаў таму назад, мова дазволіла гамінідам дзяліцца ўспамінамі

PolotskSU

і абмяркоўваць супольныя планы, выпрацоўваць новыя ўзроўні кааперацыі. Праўда, гэта гіпотэза не знайшла моцнага падмацавання ў археалагічных дадзеных, якія сведчаць толькі пра павялічэнне аб'ёму мозгу падчас гэтага перыяду, але няма доказаў змены ў жыццёвым стылі паляўнічых і збіральнікаў [8].

Яшчэ адным магчымым накірункам для пошуку крыніц мовы стала вывучэнне прыматаў, найбольш падобных да людзей жывёл. Магчыма ў іх мы можам знайсці протамову? Адна з найбольш цікавых тэорый паходжання мовы належыць антраполагу Робіну Данбару. У адрозненне ад большасці тэорый, якія выводзілі паўставанне мовы ў першых людзей з патрэбы ў арганізацыі супольнага палявання, на яго думку, мова развіваецца ў адказ на нашу патрэбу падтрымліваць стасункі з сябрамі і сям'ёю. Данбар распрацоўвае сваю тэорыю з назірання, што ў прыматаў сацыяльныя сувязі падтрымліваюцца праз працэс грумінга (узаемнага вычэсвання шэрсці). Ім можа займацца толькі адзін індывід, абедзве рукі пры гэтым занятыя. Калі памер групы павялічваецца, то такі метад падтрымання стасункаў становіцца складана падтрымліваць, і на здабычу ежы зусім не застанецца часу. Максімальны час, які можа быць патрачаны на ўзаемную чыстку, абмяжоўвае памеры групы прыматаў да 50 асобаў. Але групы гуманоідаў былі большымі па памерах, якім чынам быў адолены гэты рубеж? Данбар лічыць, што дзякуючы "vocal grooming", ці то пераходу на мову, якая дазваляе больш камфортна падтрымліваць сяброўскія сувязі, і тады час на ўзаемную чыстку можна істотна скараціць. Паводле Данбара пераход ад ручного да моўнага грумінга адбыўся з паяўленнем Homo erectus, каля двух мільёнаў гадоў таму назад. Спачатку першыя вакалізацыі не мелі нейкага сэнсу, і былі папросту зваротамі да партнёраў. Толькі са з'яўленнем *Homo sapiens* вакалізацыі набываюць сэнс, і з'яўляецца мова як такая. Праўда, гэта тэорыя не можа зняць усе істотныя пытанні: напрыклад, як з'яўляецца граматыка, якая з'яўляецца адметнасцю чалавечай мовы [7]?

Яшчэ адзін магчымы шлях для рэканструкцыі паходжання мовы звязвае яе з выкарыстаннем жэстаў. На думку фізіёлага Мерліна Дональда карані мовы ў далінгвістычных модусах камунікацыі: гэта жэсты, выразы твару, пантаміма і неартыкуляваныя гукі, да якіх і зараз звяртаюцца людзі, калі яны пазбаўленыя магчымасці выкарыстоўваць мову. Для пазначэння гэтай формы камунікацыі, заснаванай пераважна на знаках, Дональд ужывае тэрмін "мімезіс". Гэтая форма патрабуе кантролю над паводзінамі, якая цяжка даступная для прыматаў. Мімезіс незалежны ад любой мовы, яго могуць выкарыстоўваць глухія людзі, больш за тое, і зараз гэта аснова для многіх відаў мастацтва, як танец, тэатр ці пантаміма. Такім чынам, калі мы шукаем нейкую пераходную стадыю паміж малпамі і Homo Sapiens, то ў якасці такога культурнага пасярэдніка можа быць гэты далінгівістычны фармат камунікацыі, які дазваляе выбудоўваць сацыяльную згоду. Мімезіс усталяваў фундамент для свядомай камунікацыі ў гамінідаў, на яго аснове натуральны адбор мог спрыяць пашырэнню кагнітыўных здольнасцей і нейраанатамічных асаблівасцей, неабходных для паўставання словаў і камбінаторнага сінтаксісу [6].

Падобным чынам шукае вытокі мовы ў жэстах Майкл Тамасела. Эвалюцыю мовы Тамасела апісвае наступным чынам: у далёкіх продкаў чалавека (як і ў сучасных

чалавекападобных малпаў) былі жэсты, які прыцягвалі ўвагу (напрыклад, пахлопаць па зямлі), і рухі намеру (пачатковыя фазы адпаведнага дзеяння). Гэтыя прыматы маглі разумець чужыя мэты і намеры, ведаць, што бачна другой асобе і г.д.

„У аснове разумення і спараджэння гэтых жэстаў ляжаць навыкі разумення індывідуальных намераў - г.зн. таго, што ў некага ёсць свае мэты і ўяўленні пра свет. Вынікам іх выкарыстання становяцца заключэнні і высновы аб тым, што робіць іншы і, магчыма, чаму ён гэта робіць. І камунікант, і рэцыпіент маюць свае выразныя мэты ў камунікатыўным працэсе і не маюць агульных, падзяляем адзін з адным мэтаў” [2, с. 262). Потым паступова паўстаюць супольныя мэты і намеры, агульнае поле ўвагі. Жэст ужо сам па сабе не нясе вялікую колькасць інфармацыі, і каб зразумець намер “прамоўцы”, неабходна мець дастаткова шмат агульных з ім ведаў. Здольнасць ведаць пра веды іншых згуляла надзвычай важную ролю ў станаўленні мовы. Далей паяўляецца памкненне да кааперацыі і чаканне супольных паводзінаў ад партнёраў па камунікацыі, жаданне інфармаваць іншых і нарэшце фармуюцца грамадскія нормы.

«Базавыя матывы здольнасці да падзелу намераў - гэта жаданне дапамагаць і жаданне дзяліцца. У камунікатыўным узаемадзеянні яны спараджаюць тры базавых матывы кааператыўнай камунікацыі: просьба (просьба аб дапамозе), інфармаванне (прапанова дапамогі ў выглядзе карыснай інфармацыі), падзел з іншымі эмацыйных станаў і адносіны да чаго-небудзь = далучэнне (усталяванне сацыяльнага кантакту за кошт пашырэння сумеснага сэнсавага кантэксту [2, с. 263]. Менавіта магчымасць мець супольныя мэты, імкненне да супрацоўніцтва і ўзаемадапамогі Тамасела лічыць галоўнымі рухаючымі сіламі, якія прывялі да з’яўлення чалавечай мовы. Мова не магла выкарыстоўвацца для падману суродзічаў, развіццё мовы шло побач з неабходнасцю кантраляваць, прадказваць і тлумачыць паводзіны суродзічаў.

У ходзе эвалюцыі спачатку жэсты, што прыцягвалі ўвагу, змяняюцца на ўказальныя жэсты, потым рухі намеру пераўтвараюцца ў пантаміму; у рэшце рэшт фармуецца канвенцыйная мова з гукаў, у якой месца пантамімы займаюць словы.

Першапачаткова гукавыя сігналы былі, верагодна, толькі эмацыйным дапаўненнем да жэстаў; пераход жа да камунікацыі на гукавы сігнал мог быць выкліканы альбо неабходнасцю звяртацца адзін да другога на вялікай дыстанцыі, альбо з жаданнем павысіць уласны статус, паведамляць інфармацыю адразу ўсёй групе, а кожнаму яе чальцу паасобку.

Яшчэ адна важная гіпотэза, якая была ўведзена ў вывучэнне паўставання моваў у апошні час, належыць Тэрэнсу Дзікану. Ён даказвае, што мова развівалася адначасова са з’яўленнем сацыяльных кантрактаў. Кантракты не маюць фізічнай формы, але з’яўляюцца абавязковымі для чальцоў супольнасці. У негуманоідных прыматаў ніколі не ўзнікала патрэбы ў сімвалічнай камунікацыі, паколькі яны не сутыкаліся з праблемай сацыяльных кантрактаў. Калі камунікацыя датычыцца толькі актуальнай рэчаіснасці, то дастаткова паказаць на нейкі аб’ект, але калі людзі ўсталёўваюць кантракты, гэтага ўжо недастаткова. Які фізічны аб’ект будзе пазначаць “абяцанне”? Няма іншай альтэрнатывы, як пагадзіцца на нейкі агульнапрыняты сімвал. Такі сімвал мог быць часткай рытуалу, які выкарысоўваўся для замацавання кантракту. Працэсы адбору,



PolotsSU

PolotskSU

звязаныя з новым выкарыстаннем рытуальнага сімвалізму, вялі да павялічэння аб'ёмаў мозгу. На думку Дзікана такім ключавым кантрактам можна назваць патрэбу жанчын (асабліва тых, якія былі вымушаныя карміць дзяцей) замацаваць доўгатэрміновыя абязальніцтвы з боку партнёраў-мужчын. Такім чынам, эвалюцыя мовы звязваецца з пытаннямі антрапалогіі: сексуальнага канфлікту, выбару партнёраў і г.д. [5]

Трэба прызнаць, што ў апошніх працах Наом Хомскі таксама вымушаны быў адыйсці ад разумення ўніверсальнага граматыкі як прыроджанага механізму і пачаў цікавіцца эвалюцыяй мовы [4].

Можна бачыць, што пытанне пра паходжанне мовы вельмі далёкае ад вырашанасці, хоць мы значна больш сталі ведаць пра граматыку мовы, пра механізмы працы мозгу, пра паводзіны прыматаў. Тым не менш, асноўныя ідэі развіваюцца зараз у міждысцыплінарнай прасторы, на памежжы лінгвістыкі, антрапалогіі і псіхалогіі. Цяжка сказаць, ці будзе знойдзены пераканаўчы для ўсіх адказ на пытанне, як узнікла мова, але само гэта пытанне па-ранейшаму стымулюе надзвычайную навуковую актыўнасць.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Бикертон, Д. Язык Адама. Как люди создали язык. Как язык создал людей / Д. Бикертон. – Москва: Языки славянских культур, 2012. – 336 с.
2. Томаселло, М. Истоки человеческого общения / М. Томаселло. – Москва: Языки славянских культур, 2011. – 328 с.
3. Хомский, Н. Аспекты теории синтаксиса / Н. Хомский. – Москва: Издательство Московского университета, 1972. – 259 с.
4. Хомский, Н. Человек говорящий. Эволюция и язык / Н. Хомский, Р. Бервик. – Санкт-Петербург: Питер, 2018.
5. Deacon, T.W. The Symbolic Species / T.W. Deacon. – New York: Norton, 1997. – 528 p.
6. Donald, M. Origins of the Modern Mind. Cambridge / M. Donald. - MA: Harvard University Press. – 424 p.
7. Dunbar, R. Grooming, Gossip, and the Evolution of Language / R. Dunbar. – Harvard: Harvard University Press, 2002. – 242 p.
8. Pinker S. Natural Language and Natural Selection / S. Pinker, P. Bloom // Behavioral and Brain Sciences. 1990. – Vol. 13 (4). P. 707-784.
9. The Evolutionary Emergence of Language / Edited by Chris Knight, Michael Studdert-Kennedy, James R. Hurford. – Cambridge: Cambridge University Press, 2014. – 440 p.